Жырмуны

Аўтар: Паводле архіва Гродзенскай дыяцэзіі
04.10.2015 01:00



Дэканат Радунь Вёска вядома з пачатку XV ст., калі яна з'яўлялася родавым маёнткам Бутрымаў. Потым уласнасць Кучукаў, з канца XV ст. – Мантоўтавічаў, з 1513 г. – князя Юрыя Радзівіла. На карце Т. Макоўскага 1613 г. Жырмуны пазначыны як мястэчка Лідскага павета. У XVII ст. знаходзіліся ва ўладанні Завішаў, з пачатку XVIII ст. – зноў перайшлі да Радзівілаў. У 1724 г. кароль Аўгуст II надаў мястэчку магдэбургскае права.

Касцёл тут быў заснаваны ў 1437 г. па фундацыі тагачаснага ўладальніка Жырмунаў пана Войцеха Кучука. У сярэдзіне XVI ст. пры касцёле дзейнічала альтарыя.

Новы драўляны касцёл быў пабудаваны ў 1624 г. на сродкі Яна Завішы, ваяводы віцебскага, і яго жонкі Ганны Трызнянкі. Касцёл быў кансэкраваны пад тытулам Найсвяцейшай Марыі Панны і ўпасажаны "з абавязкам утрымання арганіста, школкі, кантара і слуг касцёльных". Але святыня была знішчана падчас вайны 1654–1667 гг. Новы касцёл ў 1667–1673 гг. паўстаў дзякуючы намаганням кс. Мацея Шаркевіча на сродкі пана Алойзы Кунцэвіча. Менавіта ў гэты час тут з'явілася галоўная парафіяльная рэліквія – кроплі крыві Пана Езуса. 20 сакавіка 1667 г. жонка віцебскага кашталяна Завішы, Гальшка Тышкевіч, ахвяравала іх жырмунскаму касцёлу. А ёй, атрымаўшы іх ад Папы Урбана VIII, прывёз з Рыма яе брат віленскі біскуп Тышкевіч. У 1674 г. святыню кансэкраваў біскуп суфраган Мікалай Слупскі, у яго тагачаснай візіце адзначаецца цудатворны абраз Найсвяцейшай Панны Марыі, змешчаны ў алтары касцёла. † А ў 1788–1789 гг. князь Станіслаў Радзівіл разам са сваёй жонкай Каралінай з Пацеяў ахвяравалі сродкі на ўзвядзенне цяперашняга драўлянага храма ў класіцыстычным стылі. Пабудавалі касцёл на ранейшым месцы, у цэнтры мястэчка, паводле праекта архітэктара Яна Падчашынскага, які працаваў у жырмунскім маёнтку Радзівілаў. Касцёл быў кансэкраваны пад новым тытулам Адшукання Святога Крыжа. Пры касцёле дзейнічалі парафіяльная школа і шпіталь, які фундавала лідская падстаросціна Гадзебская.

Жырмуны

Аўтар: Паводле архіва Гродзенскай дыяцэзіі
04.10.2015 01:00



[redacted].a